**А. Г. Хаменка,**
*старшы выкладчык кафедры рэжысуры*

# ПАТРЫЯТЫЗМ І НАЦЫЯНАЛІЗМ: АКТУАЛЬНАЕ АСЭНСАВАННЕ ТЭРМІНАЛОГІІ

У XVI–XIX стст., калі еўрапейскія нацыі «па чарзе» сталі аднаўляць уласную суб’ектыўнасць ў гістарычным працэсе, значную ролю атрымала з’ява, якую ў XX ст. сталі называць «нацыянальная міфалогія», ці «міфалогія нацыі» (своеасаблівая «алегарычная аўтабіяграфія нацыі»). Сярод носьбітаў або стваральнікаў нацыянальнай міфалогіі ў Нямеччыне былі Ё. Г. Гердэр і Ё. Г. Фіхтэ, у Італіі – Дж. Мадзіні, у Расіі – М. Карамзін. Нацыянальная міфалогія беларусаў, у сувязі з аб’ектыўнымі абставінамі, стала фарміравацца напрыканцы XIX ст.

Напачатку XX ст. нацыянальны рух у Беларусі ўзмацніўся, а «лакаматывам» адраджэння была творчая эліта. У 1920-х гг. у краіне беларуская нацыянальная свядомасць пачынае развівацца надзвычайна імкліва, але гэты перыяд быў вельмі кароткі. БНР і Сярэдняя Літва праіснавалі нядоўга, а беларусізацыя ў БССР скончылася ў 1937 г., калі за адну ноч з 29 на 30 лістапада былі вынішчыны больш за 100 прадстаўнікоў творчай эліты, абвінавачаныя ў «прапагандзе буржуазнага нацыяналізму». Перад Другой сусветнай вайной у БССР публічныя праявы нацыянальнай ідэнтыфікацыі зніклі практычна цалкам. Усё справаводства і вышэйшая адукацыя былі пераведзены на рускую мову. Слова «нацыяналізм» у побытавым (і навуковым) асяроддзі Беларусі яшчэ ў другой палове XX ст. успрымалася толькі пеёратыўна (з адмоўнай канатацыяй).

У свеце нацыяналізм ніколі не ўспрымаўся выключна адмоўна. У 1960-х г. Э. Кедуры – брытанскі гісторык з усходнімі каранямі – апублікаваў працу «Нацыяналізм», у якой апісаў розныя віды нацыянальных рухаў і ідэалогій. Ключавыя тэзісы яго працы наступныя: 1) падзяленне на нацыі – гэта натуральны для чалавецтва працэс; 2) нацыі маюць зададзеныя якасці і характарыстыкі, якія фармуюцца праз свядомы досвед; 3) найбольш легітымным прынцыпам дзяржаўнага кіравання з’яўляецца нацыянальнае самавызначэнне. Асобна Э. Кедуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначаў, што ў выніку эвалюцыі нацыяналізм схільны ставіць свае інтарэсы вышэй інтарэсаў асобнага чалавека, у гэтым «…сутнасць адхілення, якое прыводзіць нацыяналізм у дэструктыўны стан», – а таксама: «…пабудаваць нацыянальную незалежнасць здольныя не ўсе нацыі» [6].

Пасля Э. Кедуры амерыканскі сацыёлаг К. Дойч распрацаваў «камунікатыўную тэорыю нацыяналізму» [5]. Яна грунтуецца на такім паняцці, як «камунікатыўная эфектыўнасць», якая залежыць ад усіх механізмаў трансляцыі інфармацыі (мова, традыцыі, сімвалы, устойлівыя вобразныя сістэмы). Таксама К. Дойч адзначыў небяспеку расшчаплення «камунікатыўнай эфектыўнасці» на страты праз імкненне лідараў кантраляваць трансляцыю інфармацыі.

Напрыканцы XX ст. розныя погляды на нацыяналізм даследавалі такія навукоўцы, як: К. Д. Гірц, М. Грох, Э. Гелнер [4], Б. Андэрсан, Д. Бройі, якія сцвярджалі, што нацыяналізм – гэта від палітыкі, які мае пэўны сэнс у палітычным кантэксце арганізацыі нацыі. Нацыя ствараецца праз замацаванне палітычнага міфа, які зафіксавала палітычная эліта. Паводле Б. Андэрсана [1], сучасная тэорыя нацыяналізму грунтуецца на трыадзіным падыходзе – палітычным, эканамічным і культурным.

Такім чынам, нацыяналізм сёння разглядаецца і як *дактрына*, і як *супольная свядомасць*, і як *палітыка*. У сувязі з гэтым у адным грамадстве адначасова здольныя існаваць розныя формы нацыяналізму (у тым ліку маргінальныя). Урэшце сёння нацыяналізм падзяляюць на: *грамадзянскі, этнічны, рамантычны, культурны, вызваленчы, ліберальны,* а таксама на шэраг маргінальных форм нацыяналізму, аб'яднаных пад назвай *экспансіяніcцкі* нацыяналізм (у тым ліку нацызм).

Пры выкарыстанні ў навуковай літаратуры паняцця *патрыятызм* асобна падкрэсліваецца, што гэта *пачуццё*. Яно мае асобасную (эмпірычную) прыроду, таму што адпавядае маральнай катэгорыі «пачуццё гонару». Пры гэтым патрыятызм яднае мноства розных пачуццяў, якія звязаны з уласнай «малой радзімай», а таксама могуць абапірацца на этнічныя, культурныя аспекты. Менавіта ў гэтым паняцці нацыяналізм і патрыятызм маюць падабенства. Асобна трэба падкрэсліць, што паняцці *шавінізм* і *джынгаізм* – гэта маргінальныя формы менавіта патрыятызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дж. Оруэл у эсэ «Нататкі аб нацыяналізме» наступным чынам адрозніваў патрыятызм ад звязанай з ім канцэпцыі нацыяналізму: «Пад патрыятызмам я маю на ўвазе адданасць пэўнаму месцу і пэўнаму ладу жыцця, якое, для канкрэтна гэтай асобы, з'яўляецца лепшым у свеце. Але, гэта асоба не хоча прымушаць іншых людзей падзяляць гэтую думку і пачуццё. Патрыятызм па сваёй прыродзе абарончы, як у ваенным, так і ў культурным плане. Нацыяналізм, наадварот, гэта неад'емная частка імкнення да ўлады. Мэта кожнага нацыяналіста – забяспечыць устойлівую ўладу і прэстыж не для сябе, а для нацыі ўвогуле ці іншай адзінкі, з якой асоба вырашыла звязаць сваю індывідуальнасць» [7, с. 865].

Такія мысляры з Еўрапейскага саюза, як Ю. Хабермас, аналізавалі з'яву, вядомую як *еўрапатрыятызм*. Відавочна, што паняцце патрыятызм тут было выкарыстана таму, што пад ім разумеўся асабісты гонар за наднацыянальнае аб'яднанне (Еўразвяз), але пры гэтым еўрапатрыятызм тут уваходзіць у супярэчнасць з нацыяналізмам асобных дзяржаў і народаў Еўропы, у выніку чаго ўзнікла канцэпцыя *еўраскептыцызму*.

Лідары вядучых краін свету (у тым ліку Э. Макрон, А. Меркель) цягам апошняга дзесяцігоддзя даволі адназначна канстатавалі, што мульцікультуральная палітыка не была прынятая грамадствам, а шлях да яе цяпер успрымаецца як тупіковы – бесперспектыўны. Падобную думку падчас сваёй прамовы да Генеральнай Асамблеі ААН у верасні 2019 г. выказаў і Д. Трамп. Ключавая думка яго прамовы: «Будучыня не належыць глабалістам – будучыня належыць патрыётам» [3]. Нягледзячы на тое, што Д. Трамп выкарыстаў слова *патрыёт*, журналісты амаль аднагалосна назвалі гэту прамову нацыяналістычнай.

З іншага боку мы назіраем, што роля нацыянальна арыентаваных грамадскіх суполак значна ўзмацнілася і ў т. зв. *краінах, якія развіваюцца*. Ёсць шэраг прыкладаў, калі найбольш арганізаванымі і дзейснымі супольнасцямі, якія здольны актывізаваць трансфармацыю дзяржаўных інстытутаў, з'яўляюцца менавіта нацыянальна скіраваныя рухі. Гэта сведчыць, што абмеркаванне і ўвага да ўсіх працэсаў, звязаных з нацыяналізмам і патрыятызмам, у бліжэйшы час будзе востраактуальнай.

У выніку важна падкрэсліць, што пры выкладанні гуманітарных дысцыплін у Беларусі XXI ст. у працэсе абмеркавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэрагу тэм, звязаных з развіццём нацыянальнай культуры, будзе карысным наступнае: ужываць паняцце *нацыяналізм* з улікам таго, як разнастайна гэта паняцце асэнсоўвалася ў апошнія дзесяцігоддзі ў свеце; улічваць, што *нацыянальны* і *нацыяналістычны* ў большасці моваў свету маюць аднолькавае тлумачэнне; без залішняй сціпласці выкарыстоўваць тэрмін *патрыятызм*, у тым ліку ў такіх спалучэннях, як *патрыятычнае выхаванне*, з улікам таго, што гэтае паняцце звязана перадусім са сферай пачуццяў.


1. *Андерсон, Б.* Воображаемые сообщества. Размышления об истоках и распространении национализма [Электронны рэсурс] / Б. Андерсон // Gumer.info – Рэжым доступу: https://www.gumer.info/bibliotek_ Buks/ Sociolog/anders/index.php. – Дата доступу: 30.01.2020.

2. *Андерсон, Б.* Нации и национализм / Б. Андерсон, О. Бауэр, М. Хрох [и др.] / пер. с англ. и нем. Л. Переяславцевой, М. Панина, М. Гнедовского. – М. : Праксис, 2002. – 416 с. – (Серия «Новая наука политики»).

3. «Будущее принадлежит патриотам». Трамп выступил с трибуны Генеральной Ассамблеи ООН [Электронны рэсурс] // Tass.ru. – Рэжым доступу: https://tass.ru/mezhdunarodnaya-panorama/6923605. – Дата доступу: 30.01.2020.

4. *Геллнер, Э.* Нации и национализм [Электронны рэсурс] / Э. Геллнер // Gumer.info. – Рэжым доступу: https://www.gumer.info/bibliotek_Buks/ Polit/gelln/index.php. – Дата доступу: 30.01.2020.

5. *Deutsch, K. W.* Nationalism and Social Communication: An Inquiry Into the Foundations of Nationality / K. W. Deutsch. – New York : Technology Press of the Massachusetts Institute of Technology, and Wiley, 1953. – 292 p.

6. *Kedourie, E.* Nationalism [Электронны рэсурс] / E. Kedourie // Panarchy.org. – Рэжым доступу: http://www.panarchy.org/kedourie/ nationalism.html. – Дата доступу: 30.01.2020.

7. *Orwell, G.* Essays / G. Orwell, J. Carey. – New York : Alfred A. Knopf, 2002. – 242 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ